20. Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск: Універсітэцкае, 1992. 269 с.
21. Юхо Я. А. Судзебнік 1468 г. Статуты Вялікага княства Літоўскага // Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск: РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. С. 201–217.
22. Яцкевіч І. Г. Роль судебных решений Великого князя и Панов-Рады в процессе правообразования в Великом Княжестве Литовском в первой половине XVI в. // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі: матэрыялы міжнар. навук. -практ. канф., прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння І. А. Юхо. Мінск, 18–19 сак. 2011 г. Мінск, 2011. С. 89–91.

# ПРЫНЦЫПЫ ФАРМІРАВАННЯ ГУБЕРНАТАРСКАГА КОРПУСА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1864–1917 гг.

***Я. М. Ляпешкін***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Lia. Yauhen@gmail.com*

Разглядаюцца фактары, абставіны і асаблівасці падбору, прызначэння і звальнення губернатараў на тэрыторыі Беларусі ў 1864–1917 гг. Адзначаецца, што кіраўнікі губерняў прызначаліся на пасады і звальняліся з іх імператарам па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў. Устаноўлена, што перад тым як узначаліць губерню, існавала фармальная працэдура, якая ўключала тры этапы: кандыдацтва, знаходжанне на пасадзе і зацвярджэнне. Вызначаны прычыны губернатарскіх звальненняў. Зроблена выснова, што ў Беларусі, акрамя міністра ўнутраных спраў, значную ролю ў прызначэннях і звальненнях губернатараў адыгрываў генерал-губернатар (калі існавала гэта пасада).

***Ключавыя словы:*** прызначэнні і звальненні губернатараў; міністр унутраных спраў; генерал-губернатар; беларускія губерні.

# ПРИНЦИПЫ ФОРМИРОВАНИЯ ГУБЕРНАТОРСКОГО КОРПУСА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1864–1917 гг.

***Е. Н. Лепешкин***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Lia. Yauhen@gmail.com*

Рассмотрены факторы, обстоятельства и особенности подбора, назначения и увольнения губернаторов на территории Беларуси в 1864–1917 гг. Отмечается, что губернаторы назначались на должности и увольнялись с них императором по представлению министра внутренних дел. Установлено, что перед тем как стать главой губернии, существовала формальная процедура, включавшая три этапа: кандидатство, пребывание в должности и утверждение. Определены причины отставки губернаторов. Сделан вывод, что в Беларуси, помимо министра внутренних дел, значительную роль в назначении и увольнении губернаторов играл генерал-губернатор (когда такая должность существовала).

***Ключевые слова:*** назначения и увольнения губернаторов; министр внутренних дел; генерал-губернатор; белорусские губернии.

# PRINCIPLES OF THE FORMATION OF THE GOVERNOR'S CORPS ON THE TERRITORY OF BELARUS IN 1864–1917

***Y. M. Liapeshkin***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, Lia. Yauhen@gmail.com*

Factors, circumstances and features of the selection, appointment and dismissal of governors on the territory of Belarus in 1864–1917 are considered. It is noted that governors were appointed to positions and dismissed with their emperor, on the recommendation of the Minister of Internal Affairs. It is established that before becoming the head of the province there was a formal procedure that included three stages: candidacy, tenure and approval. The reasons for the governor's dismissals have been determined. It was concluded that in Belarus, in addition to the Minister of Internal Affairs, the Governor-General (if this position existed) played a significant role in the appointment and dismissal of governors.

***Keywords:*** appointments and dismissals of governors; Minister of the Interior; the Governor-General; Belarusian provinces.

У гістарыяграфіі актуальным застаецца пытанне губернатарскіх прызначэнняў у перыяд Расійскай імперыі, асабліва на тэрыторыі Беларусі. Чыноўніцтва працягвае выконваць важныя функцыі і ў сучасных дзяржавах. Таму варта акрэсліць фактары, вызначыць абставіны, якія ўплывалі на фарміраванне губернатарскага корпуса.

Па «Агульнаму губернскаму ўстанаўленню» расійскія губернатары ў другой палове XIX – пачатку XX ст. прызначаліся і звальняліся манархам. Але іх кандыдатуры прадстаўляў міністр унутраных спраў [22, с. 61]. Прадстаўленні па законе ад 3 мая 1829 г. павінны былі праходзіць праз Камітэт міністраў, што практычна не выконвалася [15, с. 298; 25, с. 204]. Усё справаводства аб прызначэнні і звальненні начальнікаў губерняў, якія падначальваліся міністру, вялося ў Дэпартаменце агульных спраў Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) [25, с. 204–205]. Адначасова губернатары падпарадкоўваліся генерал-губернатару на той тэрыторыі, дзе існаваў гэты інстытут улады [22, с. 157].

Вылучэнне кандыдатаў на пасаду губернатара ўваходзіла ў паўнамоцтвы не толькі міністра ўнутраных спраў, але і генерал-губернатара. Напрыклад, па прадстаўленні віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва (1863–1865) віленскім губернатарам быў прызначаны С. Ф. Панюцін (1863–1868) [12, с. 294]. У сваю чаргу, міністр унутраных спраў В. К. фон Плеве (1902–1904) вылучыў на пасаду гродзенскага губернатара П. А. Сталыпіна (1902–1903) [4, с. 113].

Як адзначаў савецкі і расійскі гісторык М. М. Шумілаў, у заканадаўстве не вызначаліся крытэрыі адбору кандыдатаў на губернатарскія пасады [25,

с. 205]. Разам з тым прапісваліся тры этапы, праз якія праходзіў будучы начальнік губерні: кандыдат на месца губернатара; знаходжанне на пасадзе губернатара (выкананне пасады) і зацвярджэнне ў гэтым званні [22, с. 61]. Акрамя таго, сучасныя даследчыкі вылучаюць фармальныя і нефармальныя крытэрыі забеспячэння кадравага складу губернатарскага корпуса [23, с. 10]. Да першых можна аднесці: дваранскае паходжанне, узрост, адукацыю, службовы досвед, а да другіх: сваяцкія і службовыя сувязі, пратэкцыю.

Звычайна на губернатарскія пасады прызначалі чыноўнікаў ці вайскоўцаў у чыне не ніжэй сапраўднага стацкага саветніка ці генерал-маёра (IV клас). Але нярэдка прызначэнцы мелі і ніжэйшы чын. Тое ж самае тычыцца і папярэдняй кар'еры службоўца. У другой палове XIX – пачатку XX ст. няўхільна праглядаецца тэндэнцыя прызначэння на губернатарскую пасаду віцэ-губернатара з той жа самай ці іншай губерняў. Аднак і гэта дынаміка не заўсёды спрацоўвала. У начальнікі губерні траплялі як з ваеннай службы, так і з грамадзянскай. Але ўсе губернатары, так ці інакш, мелі досвед папярэдняй службы.

Так, да пачатку працы на пасадзе віленскага губернатара 5 чыноўнікаў служылі віцэ-губернатарамі, 2 асобы займалі пасаду начальніка іншай губерні. Да заняцця пасады гродзенскага губернатара 8 асоб служылі віцэ-губернатарамі, 2 – губернатарамі. Непасрэдна да заняцця пасады мінскага губернатара 2 асобы мелі вопыт віцэ-губернатарства, 4 – губернатарства. Да заняцця пасады віцебскага губернатара 6 асоб служылі віцэ-губернатарамі, 4 – губернатарамі. У сваю чаргу, да заняцця пасады магілёўскага губернатара 2 асобы служылі віцэ-губернатарамі, 7 – губернатарамі. Усяго 23 асобы (з 68) ці 33,8% мелі віцэ-губернатарскі досвед, а 19 (27,9%) – кіраўніка губерні [3, с. 509–513; 4, с. 97, 102, 109, 119, 122, 133, 135, 138, 142; 18, с. 336; 8, с. 121, 628, 635; 13, с. 116–117, 153, 246, 80, 263, 271, 277; 14, с. 769, 771, 773, 775, 777, 778, 780, 783; 17, с. 56; 20, с. 249; 24, с. 109, 828].

Звычайна начальнікамі беларускіх губерняў станавіліся асобы, якія напярэдадні служылі ў іншых рэгіёнах. Хаця ў рамках Беларусі таксама назіралася ратацыя кадраў. Выяўлена, што І. М. Скварцоў у 1863 г. быў пераведзены з Вільні ў Гродна, П. Н. Шалгуноў у 1864 г. – з Віленскай губерні ў Мінскую, і ён жа ў 1868 г. – з Мінскай губерні ў Магілёўскую. У 1869 г. У. М. Токараў быў перамешчаны з Віцебскай губерні ў Мінскую, І. І. Чапялеўскі ў 1899 г. – з Віленскай у Віцебскую, Д. Ф. фон Гагман у 1905 г. – з Віцебскай у Магілёўскую, а ў 1916 г. князь У. А. Друцкой-Сакалінскі – з Магілёўскай у Мінскую [3, с. 510; 4, с. 78; 13, с. 116–117, 246, 277–278; 14, с. 770, 779].

Асаблівасцю падбору кіраўнікоў беларускіх губерняў пасля 1864 г. стала веравызнанне прэтэндэнта. Удзел у паўстанні 1863–1864 гг. дваранства пераважна каталіцкай канфесіі прывёў да недапушчэння на кіруючыя пасады каталікоў. Перавага аддавалася праваслаўным ці лютэранам [10, с. 127]. Адным з фармальных фактараў прызначэння выступала дваранскае паходжанне. Амаль усе кандыдаты на губернатарскі пост у другой палове XIX – пачатку XX ст. мелі спадчыннае дваранства. І агульнарасійская тэндэнцыя сведчыла пра тое, што колькасць прадстаўнікоў спадчыннага дваранства не змянялася. Па падліках П. А. Заянчкоўскага, усе губернатары і ў 1853, і 1903 гг. з'яўляліся спадчыннымі дваранамі [6, с. 214]. Але нельга выключаць выпадкі, калі на губернатарскі пост траплялі чыноўнікі са спадчынным дваранствам не па нараджэнні, а атрыманым за службу.

Законам не забаранялася ўзначальваць губерню тым, хто быў у ёй памешчыкам [21, с. 15]. У 1879 г. памешчыкі сярод губернатараў складалі 70% [6, с. 215]. Аднак у МУС пазбягалі прызначаць начальнікамі губерняў тых асоб, якія мелі ў іх землеўладанні. Гэта рабілася з мэтаю прадухілення выкарыстання адміністрацыйнай улады ў інтарэсах свайго маёнтка [25, с. 208]. Але здаралася, што землі набывалі ў губерні ўжо падчас кіравання ёй. Падобны выпадак адбыўся з мінскім губернатарам У. М. Токаравым (1869–1875), які набыў сялянскія землі ў Пінскім павеце Мінскай губерні. Больш за тое, прыдбанне суправаджалася парушэннямі закону. Справа стала гучнай. У выніку У. М. Токараў, ужо пераведзены ў Савет пры міністры ўнутраных спраў, у 1876 г. быў прыцягнуты да суда за злоўжыванні падчас знаходжання на пасадзе мінскага губернатара і адхілены ад службы [1, с. 229–230; 13, с. 246]. Як бачна, МУС мела рацыю: наяўнасць улады спакушала небагатых высокапастаўленых чыноўнікаў скарыстацца ёй дзеля ўзбагачэння.

У той жа час наяўнасць нерухомай маёмасці ці іншых уласных крыніц прыбытку павялічвала шансы кандыдата трапіць на губернатарскі пост. Хоць гэта пасада і аплачвалася, але і расходы, звязаныя з ёй, былі значныя [25, с. 208]. Відавочна, што падбіраючы людзей заможных, міністэрства такім чынам імкнулася пазбегнуць спроб узбагачэння за кошт губернатарскай пасады.

Пры камплектаванні асабістага складу губернатарскага корпуса моцным рычагом з'яўляліся нефармальныя фактары. Так, у прызначэннях віцебскага губернатара князя В. М. Далгарукага (1884–1894) і гродзенскага М. М. Асаргіна (1903–1905) вырашальным сталі сваяцкія сувязі. У князя В.

М. Далгарукага была сястра Кацярына. У 1880 г. яна таемна ўзяла шлюб з Аляксандрам II і ў хуткім часе разам з дзецьмі атрымала тытул найсвятлейшых князёў Юр'еўскіх [26, p. 139]. Таму, парадніўшыся з імператарам, новы сваяк атрымаў і дадатковую падстрахоўку ў сваёй кар'еры. Невыпадкова, што ён атрымаў высокую пасаду ў губерні, якая не падпарадкоўвалася генерал-губернатару.

Пост гродзенскага губернатара, які вызваляўся ў 1903 г. у сувязі з пераводам П. А. Сталыпіна ў Саратаў, М. М. Асаргіну прапанаваў віленскі генерал-губернатар князь П. Дз. Святаполк-Мірскі (1902–1904) [16, с. 573]. Незадоўга да гэтага міністр унутраных спраў В. К. фон Плеве адправіў харкаўскага віцэ-губернатара М. М. Асаргіна ў адстаўку, не ведаючы яго сувязяў. Але старэйшы брат жонкі М. М. Асаргіна князь П. М. Трубяцкой, які з'яўляўся маскоўскім губернскім прадвадзіцелем дваранства, перагаварыў з В. К. фон Плеве. У выніку міністр падтрымаў камбінацыю П. Дз. Святаполк-Мірскага, што цалкам задаволіла пакрыўджанага звальненнем чыноўніка. Будучы губернатар адразу адказаў віленскаму генерал-губернатару падзячным лістом «за давер», і «стаў чакаць прызначэння, якое не замарудзіла» [16, с. 574]. Спачатку адстаўны стацкі саветнік М. М. Асаргін быў прызначаны выконваць пасаду (в. п.) гродзенскага губернатара. «Гэта было рэдкае прызначэнне адразу з адстаўных, і на яго, зразумела, была звернута ўвага ў бюракратычных сферах і чыноўніцкім асяроддзі», – выхваляўся ва ўспамінах Міхаіл Міхайлавіч [16, с. 575]. На прыёме ў міністра ўнутраных спраў В. К. фон Плеве М. М. Асаргіну было падкрэслена, што яго «прызначэнне – жаданне генерал-губернатара, які і нясе адказнасць за свой выбар» [16, с. 580]. Такім чынам, прызначэнне начальнікам губерні, якая ўваходзіла ў склад Віленскага генерал-губернатарства, залежала не толькі ад міністра, але і ад генерал-губернатара.

На прыёме ў віленскага генерал-губернатара князя П. Дз. Святаполк-Мірскага М. М. Асаргін атрымаў настаўленне «высока трымаць рускі сцяг, але палякаў не раздражняць» [16, с. 576]. У той жа час «ніякіх дырэктыў ад Плеве я не атрымаў, – пісаў М. М. Асаргін, – ён на ўсё адказваў, што кіраўнік усёй адміністрацыйнай дзейнасці мясцовы генерал-губернатар, а не ён, міністр» [16, с. 580]. Пасля прызначэння гродзенскім губернатарам М. М. Асаргін ездзіў у С. -Пецярбург для прадстаўлення міністрам, імператару і імператрыцы. Яго аўдыенцыя ў манарха доўжылася «не больш за пяць хвілін» [16, с. 576, 579].

Трапіўшы на новае месца службы, М. М. Асаргін адразу дапусціў недарэчнасць. «Мала знаёмы з тутэйшым краем і яго асаблівасцямі», губернатар пры прадстаўленні яму службовых асоб і духавенства абышоў апошнімі прадстаўнікоў неправаслаўнага духавенства, бо яны стаялі «каля самых дзвярэй» [16, с. 600]. І ў «польскіх» колах пачалі распаўсюджвацца чуткі, што «новы губернатар дэманстратыўна выказаў знявагу Каталіцкай Царквы». «Упершыню трапіўшы ў польскі, каталіцкі край, і да таго ж у генерал-губернатарства, я не меў досведу распазнаваць усе інтрыгі…» [16, с. 600]. Зусім незнаёмы ён быў і з яўрэйскім пытаннем, у чым прызнаваўся ва ўспамінах: «мяне страшыць губернатарства ў губерні мяжы яўрэйскай аселасці» [16, с. 580]. Таму можна зрабіць выснову, што прызначэнне губернатара ў Гродзенскую губерню не ўлічвала наяўнасць у службоўца досведу працы са шматэтнічным і шматканфесійным насельніцтвам.

У падобнай сітуацыі апынуўся і іншы прызначэнец. На практыцы з яўрэйскім і «польскім» пытаннямі П. Р. Курлаў (1905–1906) пазнаёміўся толькі ў Мінскай губерні. Да гэтага, праслужыўшы ўвесь час у цэнтральных губернях Расіі, ён меў на гэты конт толькі агульныя ўяўленні [9, с. 62]. Таму наяўнасць досведу працы з яўрэйскім і «польскім» насельніцтвам не было галоўным пры падборы начальнікаў беларускіх губерняў. Для іншага чыноўніка істотным у яго кар'ерным павышэнні аказаліся не сваяцкія сувязі, а кантакты непасрэдна з імператарам.

Знаходжанне Мікалая II у разгар Першай сусветнай вайны ў Магілёве, ператварыла губернскі горад у ваенны і палітычны цэнтр дзяржавы. Таму князь У. А. Друцкой-Сакалінскі, які ў 1913–1916 гг. служыў магілёўскім віцэ-губернатарам, згадваў ва ўспамінах: «…гэта стварала нам асабліва прывілеяванае становішча ў нашым ведамстве, і міністэрства спагадліва да нас прыслухоўвалася, нават крыху паддобрывалася, а ўсе просьбы і прадстаўленні нязменна выконвала. Мы былі вельмі навідавоку і асабліва, канечне, губернатар Пільц (1910–1916). У выніку ў лютым 1916 г. А. І. Пільц быў прызначаны таварышам міністра ўнутраных спраў…» [5, с. 69]. А крыху пазней віцэ-губернатар князь У. А. Друцкой-Сакалінскі стаў начальнікам Мінскай губерні (1916–1917), прычым у вельмі маладым узросце. Адсюль вынікае, што знаходжанне Стаўкі Мікалая II у Магілёве стварыла ўнікальныя магчымасці кар'ернага росту для вышэйшых чыноўнікаў мясцовай адміністрацыі.

У лёсе іншага чыноўніка важным чыннікам стала пратэкцыя. Так, у лютым 1916 г. у Магілёў быў прызначаны губернатарам Дз. Г. Яўленскі (1916–1917). Ён быў у мінулым выхавальнікам дзяцей будучага міністра

ўнутраных спраў Б. У. Шцюрмера (сакавік–ліпень 1916 г.), працаваў начальнікам аддзялення Дэпартамента агульных спраў у бытнасць Б. У. Шцюрмера дырэктарам гэтага дэпартамента. Князь У. А. Друцкой-Сакалінскі звязваў гэта прызначэнне з тым, што «Б. У. Шцюрмер, які быў у той час міністрам унутраных спраў, відавочна, жадаў мець свайго даверанага і блізкага чалавека, які можа быць яго верным вокам і вухам пры Стаўцы і Двары» [5, с. 81]. Хоць мемуарыст памыляецца з храналогіяй, і прызначэнне адбылося раней за міністэрства Б. У. Шцюрмера, усё роўна выходзіць, што знаёмства і сумесная служба паспрыялі Дз. Г. Яўленскаму атрымаць губернатарскі пост.

У прызначэнні віцэ-губернатара князя У. А. Друцкога-Сакалінскага ў жніўні 1916 г. начальнікам Мінскай губерні [13, с. 117] рашаючымі былі не толькі асабістыя кантакты з імператарам, але і планы кіраўніцтва МУС. Справа ў тым, што дырэктар Дэпартамента агульных спраў П. П. Страмавухаў праектаваў даць князю У. А. Друцкому-Сакалінскаму губерню. Спачувальна ставіўся да гэтай задумы і міністр унутраных спраў Б. У. Шцюрмер [5, с. 88]. Новы міністр унутраных спраў А. А. Хвастоў (ліпень–верасень 1916 г.) таксама хацеў бачыць князя У. А. Друцкога-Сакалінскага губернатарам. Але яго першапачатковы праект прызначэння ў Холм імператар адхіліў, бо горад быў эвакуіраваны. Разам з тым прызначэнне ў Мінск імператар адобрыў [5, с. 92].

Князь У. А. Друцкой-Сакалінскі адразу зацвярджаўся на губернатарскім пасту, мінаючы стадыю «выконваючага пасаду». «За ўсю маю службу ў адміністрацыі я не памятаў і не ведаў аналагічнага выпадку і таму па праве вельмі ганарыўся такой выключнай да мяне Манаршай ласкай» [5, с. 92], – хваліўся ён у запісках. Абсалютна відавочна, што ў яго прызначэнні важную ролю адыграла асабістае знаёмства з манархам і неаднаразовыя сустрэчы з ім у Магілёве. Аднак у міністра ўнутраных спраў А. А. Хвастова былі свае планы на князя У. А. Друцкога-Сакалінскага: яму патрабавалася ўласная крэатура ў Мінску, каб правесці на выбарах у члены Дзяржаўнага савета ад губернскага земства патрэбнага кандыдата [5, с. 93]. Справа ў тым, што ў выбываючага члена Савета Р. А. Лашкарова на адным з пасяджэнняў здарыўся нервовы зрыў і ён знаходзіўся ў адпачынку для лячэння. Яго кандыдатура, адпаведна, адпадала. Але гэта быў адзіны кандыдат з рускіх гласных. Міністр А. А. Хвастоў лічыў непажаданым абранне «паляка» членам Дзяржаўнага савета ад Мінскай губерні. Таму ён вельмі прасіў князя У. А. Друцкога-Сакалінскага «…па магчымасці

паўплываць на абранне прымальнага і абавязкова рускага члена Дзяржаўнага савета» [5, с. 96].

У 1916 г. адбыліся выбары ў Дзяржаўны савет. Мінскі губернатар князь У. А. Друцкой-Сакалінскі (1916–1917), маючы давер з боку мясцовых прадвадзіцеляў дваранства, дабіўся пераабрання Р. А. Лашкарова членам Дзяржаўнага савета ад Міншчыны [5, с. 125]. Атрымліваецца, што намаганні міністра ў пошуку новага начальніка губерні ў дадзеным выпадку былі звязаны з вырашэннем канкрэтнай праблемы.

Усе губернатары, натуральна, мелі манархічныя погляды. «Я быў і ёсць манархіст і вернападданы свайму гасудару…» [16, с. 226], – шчыра прызнаваўся ва ўспамінах М. М. Асаргін, які ў 1903–1905 гг. служыў начальнікам Гродзенскай губерні. «Я быў і застаўся да гэтага дня перакананым манархістам» [9, с. 3], – згадваў у эміграцыі былы в. п. мінскага губернатара П. Р. Курлаў. Таму без адданасці прастолу кандыдаты на губернатарскае крэсла, безумоўна, не ўяўляліся.

На кадравую палітыку ўрада адназначна паўплывалі рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. Нерашучых губернатараў замянялі на валявых, гатовых дзейнічаць сілай. Кіраўнікі губерняў, якія цалкам задавальнялі ведамства ў мірны час, у крызісны перыяд аказаліся непрыдатныя. Так, П. Р. Курлаў быў прызначаны в. п. губернатара ў Мінск у разгар рэвалюцыі ў маі 1905 г. [13, с. 153]. Яго папярэднік граф А. А. Мусін-Пушкін не справіўся з дэманстрацыямі. Зразумела, што П. Р. Курлава накіравалі сюды навесці парадак. І ён апраўдаў спадзяванні ўрада. Да гэтага ён зарэкамендаваў сябе як рашучы кіраўнік. У пачатку 1905 г., калі П. Р. Курлаў служыў віцэ-губернатарам ў Курскай губерні, там успыхнулі сялянскія хваляванні. І губернатар накіраваў яго з эскадронам драгунаў на месца пагромаў. П. Р. Курлаў прымяніў цялесныя пакаранні і спыніў хваляванні [9, с. 39–44, 47]. А граф А. А. Мусін-Пушкін, атрымаўшы адстаўку, застаўся без пасады, хоць і з прылічэннем да МУС [1, с. 273].

Прычыны звальнення губернатараў былі і іншыя. Так, звычайна, начальнік губерні адпраўляўся на пенсію па стане здароўя. Так адбылося з магілёўскім губернатарам Дз. Г. Яўленскім. Яго звольнілі ад службы фармальна «па здароўю», але гэта быў 1917 г., калі інстытут губернатарства ўвогуле перастаў існаваць [14, с. 783]. Часцей за ўсё вышэйшы губернскі чыноўнік пераводзіўся ў іншую губерню ці ішоў на павышэнне. Як ужо згадвалася вышэй, у 1916 г. начальнік Магілёўскай губерні А. І. Пільц атрымаў прызначэнне таварышам міністра ўнутраных спраў, а яго намеснік (віцэ-губернатар) князь У. А. Друцкой-Сакалінскі – мінскім губернатарам.

Злоўжыванні вышэйшых чыноўнікаў губернскай адміністрацыі станавіліся прычынай звальнення з прэстыжнай пасады, але не абавязкова вялі да звальнення ад службы. Напрыклад, праверка дзейнасці магілёўскага губернатара В. Д. Дуніна-Баркоўскага (1870–1872) паказала, што «парушэнне закона і самавольства» складаюць адметныя рысы яго кіравання губерняй [19, арк. 69]. У выніку ён быў звольнены з пасады з прылічэннем да МУС [19, арк. 157]. Верагодна, звальненне мінскага губернатара У. М. Токарава і прызначэнне яго членам Савета пры міністры ўнутраных спраў былі звязаны таксама з яго злоўжываннямі, якія сталі вядомыя грамадскасці пазней [1, с. 229–230; 13, с. 246].

У той жа час звальненне П. Р. Курлава было звязана з наступствамі двух замахаў на яго жыццё. Таму ён сам прасіў міністра «з прычыны цяжкага, перажытага» ім у Мінску, пераводу ў іншую губерню. Паколькі міністр П. М. Дурнаво (1905–1906) не паспеў выканаць абяцання прызначыць у Ніжагародскую губерню, а новы – П. А. Сталыпін (1906–1911) – аказаўся не ў курсе, то П. Р. Курлаў увогуле прасіў звальнення ад пасады мінскага губернатара. І ў хуткім часе ён атрымаў прызначэнне членам Савета міністра ўнутраных спраў [9, с. 48, 58, 62, 69, 73]. П. А. Сталыпін прапаноўваў яму пост кіеўскага губернатара, але ён адмовіўся, таму што «быў губернатарам у самастойнай губерні і не жадаў бы ехаць у генерал-губернатарскую губерню…» [9, с. 74]. І ўсё-такі П. Р. Курлаў згадзіўся часова выконваць абавязкі кіеўскага губернатара [9, с. 75].

Наяўнасць Віленскага генерал-губернатарства накладвала адбітак на ўкамплектаванне губернатарскага корпуса ў Беларусі. Напрыклад, генерал-губернатар А. Л. Патапаў (1868–1874) дабіўся рэзкай змены яго складу. Гэта тлумачылася тым, што дзеючыя губернатары былі або стаўленікамі, або прыхільнікамі М. М. Мураўёва, ад палітычнага курсу якога А. Л. Патапаў адмежаваўся [1, с. 213]. Пры ім сваю пасаду страцілі ўсе начальнікі губерняў: мінскі губернатар П. Н. Шалгуноў быў адпраўлены на аналагічную працу падалей – у Магілёў [13, с. 278]; магілёўскага А. П. Беклемішава звольнілі ад пасады з залічэннем да МУС [14, с. 769]; віленскі губернатар С. Ф. Панюцін [12, с. 294] і яго пераемнік губернатар І. А. Шастакоў [2, с. 273], як і віцебскі (П. П. Касагоўскі) [3, с. 507], і гродзенскі (Д. М. Крапоткін) губернатары доўга не пратрымаліся [4, с. 82].

Напрыклад, міравы пасрэднік Магілёўскай губерні І. М. Захар'ін лічыў, што прычынай звальнення А. П. Беклемішава (1857–1868) стала інтрыга. Па яго словах, губернатар не паладзіў з некаторымі мясцовымі чынамі ваеннага і грамадзянскага ведамстваў. На яго пасыпаліся даносы,

але тагачасны віленскі генерал-губернатар К. П. фон Каўфман (1865–1866), «які добра ведаў увесь закулісны бок гэтай інтрыгі», падтрымаў А. П. Беклемішава ў С. -Пецярбурзе, і даносчыкі самі пацярпелі. Аднак даносы працягваліся і ў 1868 г. дасягнулі поспеху [7, с. 295–297]. Можна дадаць, што новы генерал-губернатар А. Л. Патапаў не заступіўся за падначаленага. Вынікае, што галоўны начальнік краю адыгрываў важкую ролю ў прызначэннях і звальненнях губернатараў.

Праз кадравую палітыку ўлады імкнуліся забяспечыць эфектыўнае функцыянаванне сістэмы кіравання. Паспяховыя кадравыя рашэнні павышалі гэтую эфектыўнасць. На яе ўплывалі розныя фактары: здольнасць чыноўніка да адміністрацыйнай дзейнасці, кіраўнічы досвед, веданне асаблівасцей краю, асабістыя якасці (адказнасць, працаздольнасць, хуткасць прыняцця рашэнняў, узрост, стан здароўя, і інш.) [11, с. 13]. Калі прызначэнне губернатара было няўдачным, і праз кароткі тэрмін ён замяняўся іншым, то частыя перастаноўкі не спрыялі ўмацаванню ўлады. У той жа час адсутнасць практычных ведаў па яўрэйскаму і «польскаму» пытаннях, як у сітуацыі з М. М. Асаргіным і П. Р. Курлавым, не садзейнічалі павышэнню эфектыўнасці кіравання і прэстыжу ўлады.

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX ст. губернатары прызначаліся і звальняліся з пасад імператарам па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў. Начальнікамі губерні станавіліся не адразу. Фармальны бок гэтага працэсу ўяўляў тры этапы: кандыдацтва, знаходжанне на пасадзе і зацвярджэнне. Хоць прынцыпы адбору будучых губернатараў не прапісваліся ў заканадаўстве, але ўлічваліся як дзелавыя здольнасці кандыдата і яго асабістыя якасці (службовы досвед, адукацыя, паходжанне, веравызнанне), так і ўплыў асоб (сваяцкія сувязі, службовыя кантакты, пратэкцыя). Прычым у розных сітуацыях перавагу атрымлівалі тыя ці іншыя фактары. Тое што было рашаючым у адным выпадку, у іншых умовах не заўсёды спрацоўвала.

Адстаўка на пенсію для начальніка губерні была не частай з’явай. Але калі яна здаралася, то прычынай фармальна служыў стан здароўя. Ад губернатарскай пасады вызвалялі і па іншых прычынах: за выяўленыя злоўжыванні, у выніку змены ўрадавага курсу ў рэгіёне, у сувязі з крызіснымі з’явамі. Але часцей чыноўнік перамяшчаўся на працу ў іншы рэгіён, ці на павышэнне, альбо прылічаўся да МУС.

У беларускіх губернях не толькі міністр унутраных спраў, але і генерал-губернатар (калі існавала гэта пасада) адыгрывалі значную ролю ў прызначэннях і звальненнях губернатараў. Пасля паўстання 1863–1864 гг. у

фарміраванні губернатарскага корпуса перавага аддавалася чыноўнікам праваслаўнага ці лютэранскага веравызнання. Пры гэтым досвед працы з каталіцкімі і іўдзейскімі групамі насельніцтва не быў галоўным у прызначэннях на губернатарскія пасады ў Беларусі. Урэшце, эфектыўнасць кіравання ў краі залежала ад паспяховых кадравых рашэнняў.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Бригадин П. И., Лукашевич А. М. Минские губернаторы: история власти. Минск: Гос. ин-т упр. и соц. технологий Белорус. гос. ун-та, 2009. 351 с.
2. Валуев П. А. Дневник П. А. Валуева, министра внутренних дел: в 2 т. ; ред., введ., биогр. очерк и коммент. П. А. Зайончковского. М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1961. Т. 2: 1865–1876 гг. 588 с.
3. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917): справочник / Т. Е. Леонтьева [и др.]. Минск: Белорус. науч. -исслед. ин-т документоведения и арх. дела, 2009. 523 с.
4. Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): док. -биогр. очерки / Т. Ю. Афанасьева, Р. Ф. Горячева, В. В. Швед. Гродно: Гродн. тип., 2007. 166 с.
5. Друцкой-Соколинский В. А. На службе Отечеству: зап. рус. губернатора (1914–1918 гг.). Орел: РКФ «3 июля: РИГ «Невероят. мир», 1994. 405 с.
6. Зайончковский П. А. Правительственный аппарат самодержавной России в XIX в. М.: Мысль, 1978. 288 с.
7. Захарьин И. Н. Воспоминания [о службе] в Белоруссии. 1864–1870 гг. (Из записок мирового посредника) // Тени прошлого: рассказы о былых делах. СПб., 1885. С. 162–324.
8. Крылов-Толстикович А. Н. Придворный календарь на 1915 год: комментарии. М.: [б. и.], 2015. 763 с.
9. Курлов П. Г. Гибель императорской России. М.: Современник, 1991. 255 с.
10. Лукашевич А. М. Минские губернаторы: обобщающий портрет (1793 – февраль 1917) // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права): матэрыялы Міжнар. навук. -практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2010. С. 126–129.
11. Лукашевич А. М. Непредсказуемая стабильность: губернаторский корпус в Белорусско-Литовском крае при Павле I в 1796–1801 гг. // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2022. № 2. С. 7–19.
12. Майков П. Панютин Степан Феодорович // Русский биографический словарь: в 25 т. / изд. под наблюдением пред. Императ. Рус. ист. о-ва А. А. Половцова. СПб., 1902. Т. 13. С. 293–296.
13. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства, 1793–1917: биогр. справ. / Нац. ист. арх. Беларуси; сост. Ю. Н. Снапковский; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. Минск: Беларусь, 2016. 398 с.
14. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917) / Е. К. Анищенко [и др.]; сост.: Ю. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич; редкол.: Д. В. Яцевич (гл. ред.) [и др.]. Минск: Беларусь, 2014. 814 с.
15. О порядке производства дел по Министерству внутренних дел: имен. министру внутренних дел, 3 мая 1829 г. // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2: в 55 т. СПб., 1830. Т. 4. С. 296–302.

16. Осоргин М. М. Воспоминания, или Что я слышал, что я видел и что я делал в течение всей моей жизни, 1861–1920. М.: Рос. фонд культуры [и др.], 2009. 999 с.
17. Павловский И. Ф. Полтавцы: иерархи, государственные и общественные деятели и благотворители: опыт краткого биографического словаря Полтавской губернии с половины XVIII в. Полтава: Полтав. учен. арх. комис., 1914. XV. 294 с.
18. Императорское училище правоведения и правоведы в годы мира, войны и смуты / сост. Н. Л. Пашенный. Мадрид: Изд. Ком. правовед. кассы, 1967. 457 с.
19. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1282. Воп. 3. Спр. 871. Дело о расследовании злоупотреблений по должности могилевских гражданского губернатора Дунина-Барковского и полицмейстера Палицына. 03.04.1871 – 20.04.1872.
20. Сборник биографий кавалергардов, [1724–1899]: по случаю столетнего юбилея Кавалергардского ея величества государыни императрицы Марии Федоровны полка: [в 4 т.] / сост. под ред. С. Панчулидзева. СПб.: Экспедиция заготовления гос. бумаг, 1901–1908. [Т. 4]: 1826–1908. 1908. XIV, 437 с.
21. Свод законов Российской империи: [в 16 т.] / под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. Изд. неофиц. СПб.: Деятель, 1912. Т. 9: Свод законов о состояниях. 208 с.
22. Свод законов Российской империи: изд. 1857 г.: [в 16 т.]. СПб.: Тип. II отд. Собствен. е. и. в. канцелярии, 1857. Т. 2, ч. 1: Общее губернское учреждение. 1263, 198, IV с.
23. Семёнова Н. Л. Гражданские губернаторы Оренбургской губернии: механизм и мотивы их назначения и увольнения (конец XVIII – первая четверть XIX века) // Новый ист. вестн. 2016. № 2. С. 10–26.
24. Шилов Д. Н. Члены Государственного совета Российской империи, 1801–1906 гг.: биобиблиогр. справ. / Д. Н. Шилов, Ю. А. Кузьмин. СПб.: Д. Буланин, 2007. 992 с.
25. Шумилов М. М. Губернаторские назначения в России 60–70-х годов XIX века // Россия в XIX–XX вв.: Сб. ст. к 70-летию со дня рождения Р. Ш. Ганелина; под ред. А. А. Фурсенко. СПб., 1998. С. 204–209.
26. Słownik biograficzny gubernatorów i wicegubernatorów w Królestwie Polskim (1867–1918) / A. Górak, J. Kozłowski, K. Latawiec. 2-e wyd. Lublin: Wydaw. Uniw. Marii Curie-Skłodowskiej, 2015. 543 p.

# ПРЫЧЫНЫ І ПЕРАДУМОВЫ ЎЗНІКНЕННЯ МАНУФАКТУРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

***Я. У. Макоўская***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, yana@tst.by*

У артыкуле звяртаецца ўвага чытача на праблему ўзнікнення першых мануфактур на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Робіцца спроба вылучыць палітычныя, эканамічныя прычыны ўзнікнення прадпрыемстваў новага эканамічнага тыпу. Падкрэсліваецца важнасць асабістай матывацыі заснавальнікаў першых мануфактур. Вылучаюцца асаблівасці арганізацыі і станаўлення мануфактур на беларускіх землях, падкрэсліваецца ўнікальны шлях іх арганізацыі, не падобны да еўрапейскага.

***Ключавыя словы:*** мануфактура; узнікненне мануфактурнай вытворчасці; прадпрымальніцкая дзейнасць магнатаў.